УДК 792.2 : 316.7–2.(091)

# КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ ДЗЕЙНАСЦІ БАБРУЙСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА

**Снігур Н. М., Скурат Д. С.**
Сярэдняя школа № 31 г. Бабруйска
(г. Бабруйск, Беларусь)
Навуковы кіраўнік – настаўнік беларускай мовы і літаратуры
Сямёнава А. П.

Анатацыя. У даследаванні высвятляюцца асноўныя фактары, якія ўплываюць на поспех тэатральнай дзейнасці Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча. Даецца адзнака тэндэнцый і перспектыў развіцця драматычнага тэатра ў горадзе Бабруйску. Зроблены акцэнт на айчынную драматургію, паколькі на беларускай драматургічнай прасторы з'яўляюцца маладыя аўтары, якім ёсць што прапанаваць сучаснаму гледачу. Праведзена супастаўленне агульнага і адметнага ў тэатральнай дзейнасці беларускіх драматычных тэатраў.

Ключавыя словы: тэатральная дзейнасць, фактары поспеху, глядач, айчынная драматургія, супастаўленне.

Summary.The research describes the main factors which influence the success of the theatrical activity of Mogilev regional Drama and Comedy theatre named after V. Dunin-Martinkevich. It gives the assessment of different trends and perspectives of the development of the drama theatre in the town of Bobruisk. Much attention is given to the native drama, because some young writers have appeared on the Belarusian drama stage and they have something to offer to the modern audience. There are also the most common and the different features of the theatrical activities of some Belarusian drama theatres in juxtaposition.

Key words: theatrical activity, factors of success, theatergoer, the native drama, juxtaposition.

У жыцці ўсё мяняецца, нішто не стаіць на месцы. Паўнацэнна жыць сёння і глядзець з надзеяй у будучыню нам дапамагае ў тым ліку і тэатр. Тэатр – гэта сцэнічнае мастацтва, якое нас выхоўвае, павучае са сцэны, паказвае нашы заганы жыцця, інакш кажучы, робіць нас лепшымі. Праз тэатральную дзейнасць можна прасачыць і культуру развіцця грамадства. Тэатральная дзейнасць існавала ў горадзе Бабруйску здаўна. Мы вырашылі разгледзець гісторыю развіцця тэатра за апошнія 86 гадоў. Маладое пакаленне наўрад ці ведае, што ў Бабруйску было два будынкі тэатра. Першы з'явіўся ў 1931 годзе, а другі – у 1978 годзе. Мэта даклада – выяўленне фактараў поспеху дзейнасці бабруйскага драматычнага тэатра. На жаль, звестак пра тэатральную дзейнасць у 30–50-я гады не захавалася ні ў краязнаўчым музеі, ні ў архіве горада Бабруйска, куды мы звярталіся. У музеі знаходзіцца толькі альбом з 1957 па 1972 год, у якім Таццяна Андрэеўна Бандарчык, актрыса, ад рукі запісвала колькасць пастановак, збірала газетныя публікацыі пра тэатральнае жыццё, фотаздымкі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова



**Мал. 1.** Старонка з альбома Т. А. Бандарчык

З 1957 па 1967 год на тэатральнай сцэне было паказана 5493 п'есы. Такі падлік зрабіла Таццяна Андрэеўна Бандарчык, карыстаючыся сваімі запісамі. На жаль, сёння такім падлікам ніхто не займаецца. Вядома толькі, што ў рэпертуары тэатра сёння ставіцца каля 30 п'ес для дарослых і 20 п'ес – для дзяцей. З 1931 года наш горад стаў цэнтрам эстэтычнага выхавання бабруйчан. Пра Бабруйскі тэатр ведалі не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі. Пацверджаннем гэтаму з'яўляюцца словы дырэктара Бабруйскага гарадскога краязнаўчага музея С. Філіпавай "За паўстагоддзе Савецкай улады Бабруйск па праву атрымаў славу тэатральнага горада. Можна не сумнявацца, што бліжэйшыя гады стануць гадамі далейшага развіцця і новага росквіту тэатральнага мастацтва ў Бабруйску" [9, с. 1].

І сапраўды мы ганарымся тымі, хто праслявіў Бабруйск. Можна толькі пашкадаваць аб тым, што ў тэатральным калектыве не адзін раз адбываліся змены. Напэўна, на гэта былі аб'ектыўныя прычыны. З артыкула Георгія Вавулы мы даведаліся пра тэатральную дзейнасць 1962 года: "Больш 20 спектакляў даў калектыў Бабруйскага драматычнага тэатра для гледачоў Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці. У гэтае лета тэатр прывёз такія спектаклі, як "Дзіўны дом", "Кухарка замужам", "Раскіданае гняздо". Многія гледачы пакінулі ў кнізе водгукаў запісы пра свае ўражанні. Напрыклад, пенсіянер І.А. Сіпакоў, які прагледзеў дзве пастаноўкі бабруйчан, запісаў: "Дзякуй, бабруйчанам, з вялікай цікавасцю глядзеў іх спектаклі. Яны маюць кашоўнае выхаваўчае значэнне" [3, с. 1].

Але не так усё добра было ў 70-я гады. Піша Юрый Сохар: "Які ён сёння? Што характарызуе яго дзейнасць? Трупа цяпер фарміруецца за кошт "акцёрскай біржы", шляхам штогадовага запрашэння "акцёраў-летуноў". Натуральна, розныя творчыя прынцыпы, школы, напрамкі не могуць састыкавацца. І атрымліваецца безансамблевы акцёрскі склад пэўных індывідуальнасцей, больш або менш здольных на сапраўдныя адкрыцці ў мастацтве. Спектаклі, якія ідуць сёння на сцэне тэатра драмы і камеды, маюць права на ўвагу гледачоў, але ў рэпертуары няма п'ес пра нашу рэчаіснасць, п'ес на маральна-этычныя тэмы. Гэта значыць, што клопат пра "касу" і фінансавы план усё яшчэ перашкаджае калектыву перайсці да фарміравання свайго творчага аблічча. Неабходна сістэматычная дапамога тэатру ў Бабруйску ў праглядах і абмеркаванні – спектакляў і асобных рэжысёрскіх і акцёрскіх работ – з удзелам вядучых майстроў сцэны рэспублікі, педагогаў вышэйшых навучальных устаноў, крытыкаў і тэатразнаўцаў. Тэатр абавязаны быць сучасным сёння і кожны вечар, калі ён запрашае на спектакль сучаснага гледача" [8, с. 11]. У гэтым артыкуле, як мы бачым, фінансавыя праблемы закранаюць тэатральную дзейнасць. Ад гэтага залежыць творчае аблічча. Але гэта яшчэ паўбяды. Дырэктар драматычнага тэатра Л. Падбярозкіна ў артыкуле 1990 года піша: "Рэпертуар, фарміраванне трупы, работа з гледачом і...платныя паслугі. І дзе іх узяць? Фінансавы план сёння – гэта няшчасце тэатра. Да ўсяго – мноства розных пастаноў, рашэнняў, інструкцый з катэгарычнымі рэкамендацыямі ў дзесяцідзённы тэрмін паправіць фінансавае становішча. У 1988 годзе тэатру ўдалося выканаць усе паказчыкі і пералічыць на свой рахунак 46 тысяч рублёў прыбытку. Чаму ж сёння такія мізэрныя вынікі? А проста перасталі падманваць, як гэта рабілі ўсе тэатры, працуючы па пералічэннях. Як было? Гледача няма, а грошы ёсць. І такое становішча ўсіх задавальняла. А зараз калі па сумленнаму? Ні грошай, ні гледача. І апошняе. Вялікая просьба да працоўных калектываў горада: падтрымаць нас матэрыяльна на цяперашнім этапе, даць магчымасць падняцца на ногі, стварыць тэатральны фонд.

Палюбіце тэатр! Там, дзе любоў – там добрыя справы. Прыходзьце да нас! "[6, с.2].

Глядач – гэта важная састаўная частка тэатра. Г. Вавула ў артыкуле пісаў: "Дзеці рэагуюць на спектакль больш эмацыянальна, больш раскавана, чым дарослыя, яны ўсё разумеюць і ім нічога не нада разжоўваць. А вось Надзея Канстанцінаўна Бабак, настаўніца 2-й школы, зацікавіла дзяцей творчасцю Міхася Чарота і ўключыла іх у "гульню" вакол спектакля "Мікітаў лапаць". Дзеці актыўна абмяркоўвалі ўбачанае, спрачаліся, чыталі вершы. І гэта пры тым, што зала была поўная і настрой быў святочны. Цікавым атрымаўся і ўрок па творчасці В.І. Дуніна-Марцінкевіча. Настаўніца 5-й школы Таццяна Фадзееўна Пашковіч падключыла вучняў да абмеркавання спектакля "Вечары ў Люцынцы". У гэтых мастацкіх "гульнях" удзельнічалі вучні многіх школ горада, але асабліва актыўнымі былі вучні з 2-й, 5-й, 19-й і 27-й школ. Але хто ж перашкаджае сёння настаўніку паступіць "няправільна", гэта значыць – неардынарна? Праведзены тэатральны тыдзень паказаў: саюз школы і тэатра, дае многа карыснага абодвум бакам і асабліва дзецям" [4, с. 8].

У 1994 годзе Г. Вавула пісаў: "Склалася так, што на працягу сямідзесяці гадоў савецкі тэатр толькі тым і займаўся, што выхоўваў гледача, настаўляў яго і павучаў. Вынік сумны – глядач амаль поўнасцю адбіўся ад тэатра. Праблема для нас – найгалоўнейшая. Глядач – фігура сабіральная, яму да ўсяго ёсць справа. Але... Вырашаецца адна праблема – узнікае другая. Сёння ўсё часцей чуецца голас: бензін паядае ўсё. І сапраўды, калі раней мы запраста выязджалі на гастролі ў такія гарады , як Харкаў, Адэса, Смаленск, Цірасполь, Ноўгарад, Тальяці, дык сёння нам і да Цітаўкі даехаць – праблема. Па гэтай прычыне з 1992 года тэатр не можа выехаць на летнія гастролі. Такое становішча – не нармальнае, бо, замкнуўшыся ў сваім коле, тэатр можа страціць пачуццё ўзроўню" [2, с. 7].

Дырэктар тэатра В. Шчэрбіч, даючы інтэрв'ю Т. Команавай у 2007 годзе, гаворыць пра новыя формы работы тэатра: "Каб тэатр працаваў, неабходна выдаваць 12 пастановак. Плануецца зрабіць Малую сцэну на 80 гледачоў. Упраўленне культуры абслугоўвання вёскі, дзе, у прыватнасці, будуць дакладна прапісаны выезды тэатра ў аграгарадкі два разы на месяц, нам бы яшчэ свой аўтобус – выязджаць і працаваць на вёсцы было б значна прасцей" [5, с. 8].

Такім чынам, папулярнасць Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча залежыць ад розных фактараў: фарміравання тэатральнага калектыву; сістэматычнай дапамогі тэатру ў праглядах і абмеркаванні спектакляў і асобных рэжысёрскіх і акцёрскіх работ з удзелам вядучых майстроў сцэны рэспублікі, педагогаў вышэйшых навучальных устаноў, крытыкаў і тэатразнаўцаў; фінансавай падтрымкі. Рэпертуар тэатра павінен быць разлічаны на розны ўзрост, каб тэатр наведвалі і дарослыя, і дзеці. На нашу думку, павінна быць арганізавана сувязь школы і тэатра, таму што ў рэпертуары ёсць творы беларускіх драматургаў, якія прадугледжаны школьнай праграмай. Зараз моладзь не любіць чытаць, асабліва на беларускай мове.Трэба помніць пра тое, што пакуль мова жыве – жыве і народ.

Намі быў зроблены падлік п'ес беларускіх драматургаў, пастаўленых на сцэне драматычнага тэатра горада Бабруйска. Мы спасылаліся на запісы вядомых актрыс Т.А. Бандарчык і А.І. Грахавай, а таксама карысталіся інтэрнэт-рэсурсамі. Намі вызначаны наступныя аўтары і іх п'есы: В. Дунін-Марцінкевіч "Пінская шляхта" (1977 г.), "Залёты" (1999 г.), "Ідылія" (2005 г.), А. Петрашкевіч "Злыдзень" (1973 г.), "Зловещее эхо" (1984 г.), "Ха-та-стро-фа" (1988 г.), А. Вольскі "Несцерка" (1974 г.), І. Шамякін "Золотая медаль" (1980 г.), Асташонак "Комедиант" (1984 г.), Я. Купала "Прымакі" (1989 г.), М. Чарот "Мікітаў лапаць" (1991 г.), М. Гарэцкі " Беларускія жарты" (1992 г.), А. Дзялендзік "Султан Брунея" (1996 г.), "Полуночный аукцион" (1996 г.), "Листок на ветру" (2000 г.), А. Курэйчык "Осторожно, женщины Парижа" (2007 г.), Аляксей Дудараў "Люці і ..." (2005 г.), С. Кавалёў "Тристан и Изольда" (2015 г.), Д. Багаслаўскі "Точки на временной оси" (2017 г.), М. Дасько "Лондон" ( 2017 г.). Спампавана з сайта: "З поспехам ішлі спектаклі, пастаўленыя па творах беларускіх драматургаў: "Хто смяецца апошнім" К. Крапівы, "Ірынка" Кузьмы Чорнага іншыя. Рэпертуар тэатра заўсёды быў разнастайным і ва ўсе часы яго ўпрыгожвалі творы беларускіх аўтараў. Можна ўзгадаць імёны А. Асташон-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ка, М. Матукоўскага, А. Петрашкевіча, Ю. Сохара, Я. Шабана, І. Шамякіна, А. Дзялендзіка, У. Няфёда, М. Чарота, М. Гарэцкага, Л. Родзевіча, Л. Вашко, М. Манохіна, І. Пісьменнай, А. Дударава, А. Курэйчыка, С. Кавалёва, А. Якімовіча, Г. Марчука і шмат іншых беларускіх аўтараў, з якімі супрацоўнічаў тэатр.

А ў Бабруйску Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі пачаў сваю працу (дарэчы, першымі ў Беларусі) з пастаноўкі спектакля па п'есе А. Макаёнка "Трыбунал". У аднаўленым будынку тэатр адкрыў сезон знакамітай "Пінскай шляхтай" у пастаноўцы Б. Уторава. Трэба сказаць, што тэатр у Бабруйску – адзіны ў Беларусі, які ажыццявіў пастаноўку ўсіх п'ес Дуніна-Марцінкевіча, ставіў спектаклі па яго творах, а таксама пастаноўкі пра жыццё самога Вінцэнта Іванавіча" [10].

Калі мы натрапілі на спіс спектакляў, пастаўленых у 1957 годзе ў драматычным тэатры горада Бабруйска, былі вельмі ўражаны. П'еса Я. Купалы "Раскіданае гняздо" была пастаўлена 114 разоў. Пастаноўкі дадзенага спектакля праходзілі не толькі ў горадзе Бабруйску, але і за яго межамі.


1 9 5 7 г.

"РАСКІДАНАЕ ГНЯЗДО"

| № пп. | дата | место | № пп. | дата | место |
|---|---|---|---|---|---|
| I. | I.I.57 | г.Бобруйск, театр | 31. | 5.П. | Молодечино РДК |
| 2. | 3.I | -"- -"- | 32. | 6.П | к-з Герой Труда д.Хохлов |
| 3. | 4.I | -"- -"- | 33. | 7.П | Березинское торфопредпр. |
| 4. | [illegible] | -"- -"- | 34. | 8.П | Молодечино РДК |
| 5. | 6.I | -"- -"- | 35. | IO.П | -"- |
| 6. | 8.I | -"- -"- | 36. | IO.П | к-з Я.Купалы Молод.р-н |
| 7. | 9.I | -"- -"- | 37. | II.П | Вилейка |
| 8. | II.I | -"- клуб Лесокомбината | 38. | I2.П | к-з "Белоруссия"д.Курене |
| 9. | I2.I | -"- театр | 39. | I4.П | к-з им."Сталина" |
| IO. | I3.I | -"- -"- | 40. | I5.П | Зверосовхоз |
| II. | I5.I | к-з "Коммунист" | 41. | I6.П | Радошковичи РДК |
| I2. | I6.I | Кисилевичи | 42. | I8.П | к-з им."Ленина"Свирский |
| I3. | I7.I | Глусск | 43. | I8.П | к-з "Победа" Кобыльник |
| I4. | I7.I | г.Бобруйск.в/ч | 44. | I9.П | к-з М.Горького д.Сырмеж |
| I5. | I8.I | г.Бобруйск театр | 45. | 20.П | к-з им."Сталина"Св.р-н |
| I6. | 20.I | -"- -"- | 46. | 20.П | Свирь РДК |
| I7. | 20.I | Редкий Рог | 47. | 21.П | к-з им."Буденного" |
| I8. | 23.I | к-з "IO л.БССР | 48. | 22.П | к-з I МАЯ |
| I9. | 23.I | Любань б. | 49. | 23.П | к-з "Большевик"Глуб.р-н |
| 20. | 24.I | -"- у. | 50. | 24.П | Глубокое РДК |
| 2I. | 24.I | к-з "IO л.БССР" | 51. | 24.П | -"- -"- |
| 22. | 26.I | к-з "Мичурина" | 52. | 26.П | к-з "Кирова" Обрубск.с/с |
| 23. | 26.I | -"- | 53. | 27.П | к-з "Калинина" |
| 24. | 27.I | Кировок | 54. | 28.П | к-з "За Родину" |
| 25. | 27.I | -"- | 55. | I.Ш | Сельхоз училище № 3 |
| 26. | 27.I | Минск кл.КГБ | 56. | 2.Ш | к-з "Светлый путь"Залес.с |
| 27. | I.П | Ждановичи | 57. | 3.Ш | к-з "Ворошилова" |
| 28. | П.П. | Минск телецентр | 58. | 4.Ш | к-з "Сталина" Молод.р-н |
| 29. | [illegible] | -"- Тракт.з-д | 59. | [illegible] | " Латилки" |
| 30. | [illegible].П. | к-з"За власть Советов" Королищевский с/с | 60. | 9.Ш | Старые дороги РДК |
| | | | 61. | IO.Ш | -"- |

**Мал. 2.** Мясціны, дзе ставілася п'еса " Раскіданае гняздо"

Вядома, што драматургія – гэта чуйны барометр духоўнага стану грамадства. У гутарцы з А.І. Грахавай мы даведаліся, што зараз многія рэжысёры шукаюць новыя жанры, каб зацікавіць гледача, каб быць запатрабаванымі, каб быць на слыху. Вось некалькі прыкладаў (спампавана з сайта): "17 красавіка 1999 г. адбылася прэм'ера спектакля "Залёты". Была прадстаўлена "арыгінальная", "нетрадыцыйная", "стыльная" версія п'есы нашага земляка ў пастаноўцы С. Палешчанкава.

У 2005 годзе тэатр зноў паставіў твор – спектакль "Ідылія". Рэжысёр – Сяргей Палешчанкаў. З гэтым спектаклем тэатр прыняў удзел у Міжнародным фестывалі "Классика сегодня" ў Днепрадзяржынску (Украіна), дзе атрымаў Дыплом лаўрэата VI Міжнароднага фестывалю за важкі ўклад у папулярызацыю класікі [10].

Водгук Л. Бурай з горада Бабруйска на прагледжаны спектакль А. Дударава "Людзі і ...": "Мяне проста захліснула энергія духу, што царавала на сцэне. Энергетыка акцёраў пералівалася ў глядзельную залу, змушаючы нас заміраць у некаторыя імгненні. Дзякуй, што ў нас у Бабруйску ёсць тэатр, дзе працуюць цікавыя акцёры і ідуць добрыя спектаклі" [1, с. 9]. І яшчэ водгук Д. Серабракова на пастаноўку У. Савіцкага па п'есе А. Макаёнка "Зацюканы апостал": "Пастаноўка стала сапраўдным адкрыццём не толькі для тэатра, а нават і для саміх акцёраў. Упрыгожвае пастаноўку акцёрская гульня "ветэранаў" бабруйскай сцэны А. Грахавай і А. Парфяновіча" [7, с. 9].

Намі было падлічана, што 25 п'ес беларускіх пісьменнікаў было пастаўлена на сцэне драматычнага тэатра горада Бабруйска. І гэта толькі пастаноўкі для дарослых. На жаль, творы сучасных беларускіх аўтараў ставяцца на рускай мове, каб толькі прыцягнуць увагу гледачоў. І ў той жа час вельмі радасна за тое, што творы беларускіх аўтараў упрыгожвалі і зараз упрыгожваюць рэпертуар тэатра.

Мы вырашылі супаставіць тэатральную дзейнасць розных беларускіх драматычных тэатраў. Адказы нам даслалі драматычныя тэатры з Гродна, Магілёва, Віцебска, Мінска. Нас цікавіла: п'есы якіх беларускіх драматургаў ставіліся на сцэне тэатра? У рэпертуары Нацыянальнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа на сённяшні дзень 16 спектакляў па творах беларускіх пісьменнікаў: М. Чарот "Мікітаў лапаць", У. Караткевіч "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", В. Вольскі "Несцерка", монаспектаклі: В. Быкаў "Незагойная рана", Я. Брыль "Memento mori" і інш. Кіраўніцтва і творчыя работнікі Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра надаюць вялікае значэнне айчыннай драматургіі. Пастаноўкі па творах беларускіх аўтараў складаюць адну чацвертую частку рэпертуару. У Новым драматычным тэатры горада Мінска ставіліся спектаклі па п'есах А. Макаёнка, А. Гаруна, М. Матукоўскага, П. Макаля. У Гродзенскім драматычным тэатры за апошнія 10 гадоў ставіліся п'есы Я. Купалы, С. Кавалёва, Н. Віленчык, С. Марэцкай, у дзеючым рэпертуары тэатра ідуць п'есы У. Рудава, А. Машынковай.

Яшчэ нам хацелася даведацца, як гледачы ў розных гарадах адносяцца да пастановак на беларускай мове. У Нацыянальным драматычным тэатры імя Я. Коласа ўсе пастаноўкі ставяцца на беларускай мове, а ў Магілёўскім абласным драматычным тэатры толькі на рускай мове. У Гродзенскім драматычным тэатры сённяшнія гледачы перавагу аддаюць патаноўкам на рускай мове.

Што ж датычыцца наступнага пытання, нас цікавіла, гледачы якога ўзросту больш наведваюць тэатр? У Віцебскім і Магілёўскім тэатрах спектаклі наведваюць гледачы самага рознага ўзросту, а ў Гродзенскім драматычным тэатры сярод гледачоў, згодна са шматгадовай статыстыкай, пераважаюць асобы жаночага полу ад 35 да 50 гадоў. Агульнае тое, што ўсе тэатры ставяць п'есы беларускіх драматургаў, што аўдыторыя ў тэатрах Бабруйска, Магілёва, Віцебска рознаўзроставая. Адметнае – у Гродзенскім драматычным тэатры сярод гледачоў, згодна са шматгадовай статыстыкай, пераважаюць асобы жаночага полу ад 35 да 50 гадоў. Агульнае – пастаноўкі ставяць як на рускай, так і беларускай мовах у Бабруйскім, Гродзенскім драматычных тэатрах. Адметнае – у Віцебскім драматычным тэатры пастаноўкі толькі на беларускай мове, а ў Магілёўскім тэатры толькі на рускай мове. Аднак гэты недахоп у тэатры Магілёва быў выпраўлены: у 2018 г. пастаноўка С. Кавалёва "Тямніцы старой ратушы" – на беларускай мове.

Мы паспрабавалі даказаць, што тэатр з'яўляецца неад'емнай часткай нашага жыцця. Актрыса Таццяна Андрэеўна Бандарчык зрабіла ўсё для таго, каб ушанаваць і захаваць памяць пра тэатральны Бабруйск. За што ёй вялікі дзякуй. Нам, моладзі, сорамна не ведаць тых, хто сваім талентам рабіў гісторыю культурнай спадчыны нашага горада.

**Літаратура:**


1. Бурая, Л. Бабруйская art-тэрапія / Л. Бурая // Культура. – 2005. – № 22. – 28 мая – 3 чэрвеня. – С. 9.
2. Вавула, Г. Абавязак перад культурай / Г. Вавула // Бабруйскае жыццё. – 1994. – 27 верасня. – С. 7.
3. Вавула, Г. Радасная сустрэча / Г. Вавула // За перамогу камунізма. – 1962. – № 37. – 28 ліпеня. – С. 1.
4. Вавула, Г. Уключайцеся ў гульню / Г. Вавула // Бабруйскае жыццё. – 1994. – 13 снежня. – С. 8.
5. Команава, Т. Патрэбны новыя формы / Т. Команава // Культура. – 2007. – № 4. – 27 студзеня – 2 лютага. – С. 8.
6. Падбярозкіна, Л. Свята з сумнай нотай / Л. Падбярозкіна // Камуніст. – 1999. – 27 сак. – С. 2.
7. Серабракоў, Д. Асаблівасці правінцыйнай "Ідыліі" / Д. Серабракоў // Культура. – 2005. – № 22. – 28 мая – 3 чэрвеня. – С. 9.
8. Сохар, Ю. Ёсць у Бабруйску тэатр... / Ю. Сохар // ЛіМ. – 1977. – 18 лютага. – С. 11.
9. Філіпава, С. Мастацтва належыць народу (да гісторыі развіцця тэатра ў Бабруйску) / С. Філіпава // Камуніст. – 1967. – 23 жніўня. – С. 1.
10. Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча [Электронны рэсурс]. – Бабруйск, 2018. – Рэжым доступу: http://www.teatr-bobr.by/ – Дата доступу: 15.12.2018.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова